Саверчанка, І.В. Міхаіл Гарабурда – выдатны дыпламат і пісьменнік / І.В.Саверчанка // Гісторыя і грамадазнаўства. 2012. № 1. С. 66 – 70.

Іван САВЕРЧАНКА,
доктар філалагічных навук,
вядучы навуковы супрацоўнік
Інстытута мовы і літаратуры імя Я.Коласа і Я.Купалы
НАН Беларусі

# МІХАІЛ ГАРАБУРДА – ВЫДАТНЫ ДЫПЛАМАТ І ПІСЬМЕННІК

Міхаіл Гарабурда (пач. XVI – 1586) – знакаміты дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, дыпламат і пісьменнік эпохі Рэнесансу. Ён займаў пасады дзяржаўнага сакратара ВКЛ і менскага кашталяна (1585) некалькі разоў наведваў Маскоўскае княства ў складзе вялікіх пасольстваў (1573, 1585).

Пяру М.Гарабурды належыць “Рэляцыя пасольства 1573 года ў Маскоўскае княства”, у якой ён зафіксаваў падзеі дыпламатычнай місіі 1573 г., асвятліў складаныя перагаворы з царом Іванам IV. На старонках “Рэляцыі…” М.Гарабурда паведаміў абставіны і мэты візіту ў Расійскую дзяржаву, час прыбыцця паслоў у Вялікі Ноўгарад, дзе на той момант знаходзіўся маскоўскі князь. Цэнтральнае месца ў творы займаюць апісанні афіцыйных прыёмаў у цара, звесткі пра ўдзельнікаў аўдыенцый, адказы Івана IV вялікаму паслу.

З тэксту “Рэляцыі…” становіцца выразна зразумелым, якія ўмовы выстаўлялі беларускія магнаты Івану IV і яго сыну Фёдару, запрашаючы іх на трон ВКЛ. Найперш, яны патрабавалі захавання ўласных правоў, свабодаў і вольнасцяў, а таксама вяртання ў склад ВКЛ Смаленска, Полацка, Усвятаў, Азярышча і іншых гарадоў і земляў, забраных Маскоўскім княствам падчас вайны.

З іншага боку, на старонках “Рэляцыі…” пералічаны ўмовы, на якіх Іван IV і яго сын Фёдар згаджаліся стаць гаспадарамі ВКЛ і Польшчы. Маскоўскі валадар ў яго прамове не толькі настойваў на захаванні ў складзе Маскоўскай дзяржавы заваяваных тэрыторый, але і патрабаваў перадаць пад яго ўладу Кіеў і Інфлянцкую зямлю. Як сведчыць змест “Рэляцыі…”, Іван IV ультыматыўна патрабаваў, каб паны ВКЛ адразу ўсклалі на сябе абавязак заўжды абіраць у якасці вялікіх князёў ВКЛ толькі яго нашчадкаў. У выпадку абрання асабіста яго гаспадаром, Іван IV абяцаў вярнуць ВКЛ Полацк і Курляндскую зямлю.

На стронках “Рэляцыі…” М.Гарабурда падкрэсліў, што Іван IV пагаджаўся валадарыць толькі ў ВКЛ, не прэтэндуючы на Польскае каралеўства: “Мы і на адным Княстве Літоўскім пагодзімся быць”, – з апломбам заяўляў ён (с. 242). Пры гэтым Іван IV абяцаў вярнуць у склад ВКЛ землі Княства, якія раней адыйшлі да Польшчы, за выключэннем Кіева. Паводле сведчання М.Гарабурды, маскоўскі манарх выказваў катэгарычны пратэст супраць абрання на трон ВКЛ прадстаўніка французскага двара, пагражаючы ў адваротным выпадку вайной.

У “Рэляцыі…” М. Гарабурда раскрыў амбіцыйную канцэпцыю ўлады, якую сфармулявалі і пачалі актыўна эксплуатаваць у XVI ст. маскоўскія манархі. Яе сутнасць у тым, што кіроўная маскоўская дынастыя нібыта ўсталяваная самім Госпадам, і што яна ўзыходзіць да рымскага імператара Аўгуста. М.Гарабурда прыгадаў красамоўную заяву Івана IV: “Мы ўладары ад Уладара, і адлічваем нашу ўладу ад імператара Аўгуста, ад пачатку вякоў, і ўсім людзям тое вядома” (с.239). Паводле логікі маскоўскіх князёў, Масква – гэта трэці Рым, новая сталіца свету, а яны – сапраўдныя і адзіныя валадары над славянскімі народамі і ўсімі астатнімі землямі. У тэксце “Рэляцыі…” М.Гарабурда змясціў безапеляцыйнае патрабаванне Івана IV ужываць у дачыненні да яго царскі тытул з пералікам зямель і дзяржаў, на якія той прэтэндаваў.

Пераклад “Рэляцыі пасольства 1573 года ў Маскоўскае княства” М.Гарабурды ажыццёўлены паводле выд.: Акты исторические, относящиеся к Росиии, извлеченные из иностранных архивов и библиотек. СПб., 1841. Т.1. С. 237 – 242.

## Рэляцыя пасольства 1573 года ў Маскоўскае княства

Я, Міхаіл Гарабурда, быў накіраваны Панамі-Радай Вялікага Княства Літоўскага ў якасці пасла да вялікага князя маскоўскага. Прыбыў я да яго 23 лютага ў панядзелак у Вялікі Ноўгарад, дзе ён на той момант знаходзіўся. Назаўтра, у аўторак, 24 лютага, вялікі князь загадаў мне быць у яго на аўдыенцыі. Ён выслухаў маю прамову. Затым я быў у яго на ўрачыстым абедзе.

У сераду, 25 лютага, я слова ў слова пераказаў вялікаму князю словы іх міласцяў Паноў-Рады. У пакоі, прызначаным для афіцыйных прыёмаў, вялікі князь асабіста выслухаў усе мае прамовы. Разам з ім сядзеў яго старэйшы сын Іван. Пры вялікім князю таксама знаходзіліся: акольнічы і мажайскі намеснік Васіль Іванавіч Умны, думны дваранін і наваторжскі намеснік Міхайла Цімафеевіч Пляшчэеў, дзяк Андрэй і Васіль Факоўскі-Шчаўкалаў.

Маскоўскі князь выслухаў прамовы ад імя Паноў-Рады, якія я агучыў, а затым загадаў перадаць яму іх у пісьмовым выглядзе. Затым ён

распарадзіўся, каб я яшчэ раз паўтарыў сказанае, а Андрэю Шчаўкалаву загадаў адразу усё перакладаць яму. Я прамаўляў, а Андрэй Шчаўкалаў перакладаў. Затым вялікі князь загадаў мне ехаць да гасподы (пасольскага двара).

28 лютага, у суботу я быў пакліканы да вялікага князя. На ўсе заявы, якія я агучыў яму мінулы раз, ён даў разгорнуты адказ:

“Ты прасіў нас ад імя Рады Вялікага Княства Літоўскага адкрыць Панам-Радзе нашу волю адносна нашага ўладарання ў Польскай Кароне і Вялікім Княстве Літоўскім.

Найперш, абяцаю захоўваць усе вашы вольнасці, свабоды і правы. Гатовы пацвердзіць іх асабістай прысягай, а таксама прысягай абодвух маіх сыноў. Звыш таго, буду ўзнагароджваць вас новымі вольнасцямі і свабодамі.

Мы жадалі прапанаваць Панам-Радзе праз іх пасланніка, як канкрэтна належыць здзейсніць тую добрую справу. Паны-Рада гэтаксама даўно мелі намер накіраваць да нас пасла. Але Божай воляй і з прычыны эпідэміі ў шмат якіх месцах Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага Паны-Рада не маглі сустрэцца са сваімі братамі – польскімі Панамі-Радай, каб нарэшце распачаць добрую справу. Праводзіць жа з’езд толькі паноў Вялікага Княства Літоўскага, без удзелу польскага боку, і накіроўваць да нас пасла самостойна, ім нельга.

Калі эпідэмія крыху спала, Паны-Рада Вялікага Княства Літоўскага сустрэліся з некаторымі польскімі панамі ў Вільні і абгаварылі тую важную справу. Яны прыйшлі да згоды і накіравалі ў Варшаву некалькіх паноў з прапановай склікаць агульны Сойм для абрання сабе гаспадара.

Неўзабаве Паны-Рада з’ехаліся са сваімі польскімі братамі і пачалі з імі раіцца, каб нас або нашага сына Фёдара ўзяць на абедзве дзяржавы – Польскае Каралеўства і Вялікае Княства Літоўскае. Паны-Рада і рыцарства Вялікага Княства Літоўскага прытрымліваліся колішніх дамоўленасцяў з Польскай Каронай і не хацелі аднаасобна, без палякаў, абіраць сабе гаспадара. Яны жадалі супольна выказаць уласную волю і абраць нас або нашага сына на абедзве дзяржавы. Мы са свайго боку, калі выбар спыніцца на нас, выказалі гатоўнасць пацвердзіць усе вашы свабоды, правы і вольнасці. Разам з намі і нашы сыны, князь Іван і князь Фёдар, гэтаксама пацвердзяць вашы правы і свабоды ўласнымі прысягамі і замацуюць адпаведнымі лістамі. У выпадку абрання гаспадаром нашага сына Фёдара ён не парушыць вашых свабод, правоў і вольнасцяў, а вечна будзе іх захоўваць. Па просьбе Паноў-Рады і рыцарства князь Фёдар будзе надзяляць вас новымі правамі і свабодамі. Асабліва нас усцешыла паведамленне, перададзенае праз пасла Фёдара Варапая, што вы ўжо гатовыя абвесціць вашу волю і здзейсніць тую добрую справу.

Цяпер аб *вечным міры*, пра які ты гаварыў. Ты прасіў ўсталяваць вечны мір і вызначыць дакладныя межы паміж краінамі. Прапаноўваў, каб мы гарады Смаленск і Полацк, Усвяты і Езярышча вярнулі Вялікаму Княству Літоўскаму, якому яны належалі з даўніх часоў. Гэтаксама прапаноўваў, каб мы разам з нашым сынам Фёдарам перадалі Вялікаму Княству Літоўскаму новыя замкі і воласці. У такім разе, народы, якія дабраахвотна абяруць яго на панства, не будуць мець прэтэнзій да суседзяў.

Таксама гаварыў нам, што Паны-Рада з-за эпідэміі не маглі накіраваць да нас пасла на працягу доўгага часу. Сапраўды, на ўсё Божая воля. Панам-Радзе аднак належала б ведаць, што пытанне аб уладзе не варта адтэрміноўваць, бо небяспечна краіне быць без гаспадара.

Адносна таго, што Паны-Рада Вялікага Княства Літоўскага не хочуць абіраць сабе гаспадара аднаасобна, без палякаў, на тое іх воля.

Гаварыў пра захаванне *правоў і вольнасцяў*. Гэта справа натуральная. Мы мяркуем, калі ў нейкай зямлі ўсталяваны пэўны звычай, яго не варта адмяняць. Мы і нашы дзеці прысягай пацвердзім захаванне звычаяў, што існуюць у вашай краіне.

А цяпер адносна тваёй заявы, каб мы вярнулі *Смаленск і Полацк, Усвяты і Езярышча*. Гэтыя патрабаванні беспадстаўныя. З якой нагоды мы павінны змяншаць тэрыторыю нашай краіны!? Добры гаспадар пашырае межы дзяржавы, а не змяншае. Навошта нам аддаваць вам свайго сына, калі гэта спрычыніцца да стратаў у нашай  дзяржаве!? І тым больш, мы не збіраемся перадаваць вам разам з нашым сынам, князем Фёдарам, аніякіх новых замкаў і воласцяў. І без нашых гарадоў і земляў у Польскай Кароне і Вялікім Княстве Літоўскім шмат ёсць замкаў і воласцяў, над якімі мы, або наш сын Фёдар, мяркуем валадарыць.

Што датычыць *Інфлянцкай зямлі*, дык пра яе Паны-Рада анічога нам не паведамілі. Толькі ад свайго імя кажаш, што ўсе пытанні, якія нас цікавяць, будуць узгадняцца на супольным з’ездзе паноў Вялікага Княства Літоўскага і Польскай Кароны. Нічога пэўнага не гаворыш нам, адно толькі абяцаеш, што Паны-Рада спачатку ўсё ўзгодняць міжсобку, а затым накіруюць да нас новага пасла. А ты толькі прыехаў дзеля адной рэчы, каб даведацца, ці згодны мы або наш сын князь Фёдар, гаспадарыць на вашых землях.

Для нас абразліва гучыць ваша пярэчанне, каб наш нашчадак пасля нашага гаспадарання гэтаксама быў на вашым панстве. Яшчэ вы пярэчыце злучэнню Польскай Кароны, Вялікага Княства Літоўскага і Маскоўскага княства ў адзіную дзяржаву. Мы не можам пагадзіцца з гэткімі ўмовамі і таму адмаўляемся ад вашай прапановы ўзыйсці на трон польскага караля і вялікага князя літоўскага. Пры гэтакіх варунках нам не выпадае і сына нашага Фёдара аддаваць вам ва ўладары.

Мы ведаем, што да вас накіравалі паслоў імператар і французскі манарх, шукаючы польскай кароны і трона вялікага князя Вялікага Княства Літоўскага. Але мы добра ведаем, што апрача нас і турэцкага султана няма манарха, продкі якога б цягам 200 год ажыццяўлялі ўладу і паходзілі б ад валадарскіх народаў. Некаторыя ўзыходзяць на царствы і каралеўствы з дробных княстваў, ці з нейкіх іншых нязначных пасадаў, таму яны і шукаюць гонару і павагі. А мы – гаспадары ад гаспадароў, пачынаючы ад імператара Аўгуста, ад пачатку пачаткаў. І ўсім людзям аб гэтым добра вядома.

Польская Карона і Вялікае Княства Літоўскае зусім не голыя, валадарыць над імі можна. Але наш сын не дзеўка, каб даваць за ім пасаг (прыданае). Калі Паны-Рада хочуць нас паклікаць да сябе, няхай перададуць нам належную колькасць земляў і замкаў, якіх шмат у Польскай Кароне і ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Перадай Панам-Радзе, што мы хочам, каб тая добрая справа здзейнілася гэтак, як мы табе аб'явілі.

Па-першае, калі яны хочуць нас мець у сябе ў якасці гаспадара, няхай спачатку пачнуць тытулаваць нас "царом", бо мы мелі царскі тытул ад пачаткаў; мы не перанялі яго ад чужых валадароў, а ўзялі ад нашых продкаў.

Па-другое, калі нашага сына Фёдара Бог забярэ з гэтага свету, а ў яго застануцца дзеці, у такім разе Польская Карона і Вялікае Княства Літоўскае павінны выбраць сабе ў якасці манарха некага з іх, а не шукаць сабе пана ў іншых землях. У выпадку, калі ў нашага сына не будзе дзяцей, тады Польская Карона і Вялікае Княства Літоўскае не павінны адрывацца ад нашага народу, а мусяць заставацца ў нас і ва ўладзе нашых дзяцей датуль, пакуль наш род дабраславеннем Божым будзе валадарыць.

Па-трэцяе, калі хтосьці з нашага роду развітаецца з гэтым светам і яго душа пойдзе да Бога, то яго цела мусіць быць перавезена ў нашу дзяржаву, да нашага роду, а там, у вас, – не класці яго.

Нашы дзеці і наш род, знаходзячыся на Польскай Кароне і троне ВКЛ, ні ў чым не парушаць вашых правоў і вольнасцяў.

Мы хочам, каб злучыліся ў адзіную дзяржаву Польская Карона, Вялікае Княства Літоўскае і нашае гаспадарства. Мы жадаем, каб у нашым тытуле было зафіксавана, што мы з'яўляемся валадаром Польскай Кароны і Вялікага Княства Літоўскага.

Мы будзем супольна выступаць супраць знешніх непрыяцеляў і разам абараняцца ад ворагаў.

Паколькі мы маем тытул цара, то Кіеў павінен перайсці да нашай дзяржавы.

Раней межы нашай дзяржавы даходзілі да Бярэзіны, але дзеля хрысціянскага прымірэння на гэтым зараз не настойваем. Але Полацк з прыгарадамі і ўся Інфлянцкая зямля павінны застацца на нашым баку. Яны павінны належыць Маскоўскаму княству, інакш сына нашага, князя Фёдара, не адпусцім гаспадарыць да вас. Да таго ж, ён яшчэ не саспеў, яму не шмат гадоў, і ў выпадку патрэбы ён не зможа стаць супраць вашых і ўласных непрыяцеляў.

Дзеля хрысціянскага замірэння абвяшчаю цяпер нашу волю Панам-Радзе Кароны Польскай і Вялікага Княства Літоўскага. Мы хочам з імі навякі дамовіцца аб наступным.

Полацк з усімі прыгарадамі і ўся Курляндская зямля за ракой Дзвіной павінны назаўжды застацца ў нашым Маскоўскім гаспадарстве. Мяжой паміж нашай дзяржавай і Вялікім Княствам Літоўскім павінна быць рака Дзвіна.

Полацк з прыгарадамі будуць уключаны ў склад нашай дзяржавы, а астатняя граніца пройдзе па старых межах, як запісана ў прымірэнчых лістах.

Мы супольна будзем выступаць супраць усіх нашых непрыяцеляў, мы будзем дапамагаць Польскай Кароне і Вялікаму Княству Літоўскаму, а яны будуць дапамагаць нам.

Калі ж гаспадаром Польскай Кароны і Вялікага Княства Літоўскага будзе абраны імператарскі сын, то няхай бы ён жыў з намі ў братэрстве, падмацаваў гэтае рашэнне ўласнай прысягай і пісьмовай пастановай. Мы б жадалі падпісаць з імператарам і яго сынам дамову аб міры, каб супольна выступаць супраць непрыяцеляў, падчас вайны з паганскімі панамі дасылаць вайсковую дапамогу. А калі з-за адлегласці будзе складана пасылаць войска, дык дапамагаць грашыма і маёмасцю.

Калі нашыя дзяржавы дамовяцца аб міры і ўзаемнай дапамозе, то ад гэтага будзе вялікая карысць хрысціянскаму свету. А мы жадаем усялякага дабра Польскай Кароне, Вялікаму Княству Літоўскаму і ўсяму хрысціянству […]

Апрача таго, мне вядома, што многія вашы і польскія паны, хочуць абраць за гаспадара мяне, а не нашага сына. І гэта было б лепей, каб я сам стаў вашым валадаром”.

Я ўбачыў, што маскоўскі князь хоча асабіста быць абраным на Польскае Каралеўства і на трон Вялікага Княства Літоўскага. У адказ я выклаў яму нашы ўмовы:

“Паны-Рада і ўсё рыцарства чакаюць ад новага гаспадара, каб ён з Божай дапамогай панаваў на нашых землях і абараняў нашы дзяржавы ад знешніх непрыяцеляў. А ў маскоўскага князя ёсць Казань і Астрахань, якія знаходзяцца надта далёка. Дзеля абароны падуладных земляў, гаспадар

мусіць часта ездзіць з адной зямлі ў іншую. А паколькі ўладанні маскоўскага князя займаюць велізарныя абшары, ён не зможа належным чынам абараніць іх. Ад манарха патрабуецца справядліва вырашаць унутраныя спрэчкі, чаго маскоўскі князь таксама не зможа рабіць своечасова і належным парадкам. Апрача таго, у нас не прынята, каб гаспадар ад'язджаў з краіны і пакідаў некага замест сябе. Да таго ж, без прыняцця каталіцкай веры, ніхто не можа стаць гаспадаром у Польскім Каралеўстве і Вялікім Княстве Літоўскім".

Вялікі князь маскоўскі выслухаў мяне, а потым загадаў ехаць да гасподы.

Назаўтра, 1 сакавіка, у нядзелю, я зноў быў на аўдыенцыі ў вялікага князя. Там ён даў мне наступны адказ:

"Мы хочам быць гаспадаром над Маскоўскім княствам, Польскім Каралеўствам і Вялікім Княствам Літоўскім. Мы здолеем абараніць дзяржавы, хутка прыязджаць і знаходзіцца ў той зямлі, дзе будзе патрэбна. Усе прычыны, якія ты пералічыў, не будуць перашкаджаць нашаму валадаранню. Няхай станецца так, каб у нашым тытуле фігуравала Маскоўскае княства, Польскае Каралеўства і Вялікае Княства Літоўскае. Да Маскоўскага княства павінны перайсці Кіеў, але без прыгарадаў. А Полацк з прыгарадамі і Курляндская зямля за Дзвіной няхай застануцца Вялікаму Княству Літоўскаму. Інфлянцкая зямля да ракі Дзвіны павінна быць прыпісана да нашага панства, як мы і гаварылі раней.

Наш тытул павінен пісацца наступным чынам: "З Божай ласкі гаспадар, цар і вялікі князь Іван Васільевіч усяе Русі, Кіеўскі, Уладзімірскі, Маскоўскі, кароль польскі і вялікі князь літоўскі, вялікі князь рускі Вялікага Ноўгарада, цар Казанскі, цар Астраханскі".

А веры нашай быць у асаблівай пашане. Мы дазволім узводзіць касцёлы ў гарадах, воласцях і замках, каменныя і драўляныя. Мітрапаліта і епіскапаў будзем шанаваць паводле нашага звычаю.

Мы будзем непарушна захоўваць усе правы і вольнасці Паноў-Рады Вялікага Княства Літоўскага і Польскай Кароны, а таксама будзем узнгароджваць іх пасадамі і маёмасцю ў адпаведнасці з іх заслугамі.

Просім, каб Паны-Рада дазволілі нам у старасці пайсці ў манастыр, дзе мы станем маліцца Богу. Панам-Радзе і ўсёй вашай зямлі належыць пасля мяне абіраць на панства нашых дзяцей, на што мы дадзім наш дазвол.

Калі Вялікае Княства Літоўскае пажадае, каб я гаспадарыў толькі на землях Княства, без Польскай Кароны, то мы прымем гэта з яшчэ большай удзячнасцю. Мы хочам гаспадарыць у Вялікім Княстве Літоўскім і далей трымаць Маскоўскае княства. Калі гэтак здарыцца, мы абяцаем вярнуць Вялікаму Княству Літоўскаму тыя землі, якія былі забраны Польскай Каронай, аб чым мы добра ведаем. Усе колішнія тэрыторыі Вялікага Княства

Літоўскага будуць вернуты ў яго склад, апрача аднаго Кіева. Без прыгарадаў ён мусіць перайсці да нашага Маскоўскага княства.

Мы хочам, каб Польская Карона і Вялікае Княства Літоўскае заўжды абіралі ў якасці гаспадароў толькі нашых дзяцей. А мы з свайго боку выканаем усё, што паабяцалі.

Паведамляем табе, што ў вашу дзяржаву мы прыедзем разам з нашымі дзецьмі, бо ім не шмат год і адпускаць іх без бацькоўскага дагляду нельга. Тым больш, што да нас дайшлі чуткі, нібыта вы хочаце ўзяць нашага сына дзеля ўчынення злачынства. Вы хочаце перадаць яго турэцкаму султану, бо маеце намер паяднацца з султанам. Не ведаю, ці праўда ўсё гэта, або толькі выдумкі злых людзей. Але мы павінны былі выказаць табе нашы засцярогі, бо прыйшоў час, калі належыць усё абгаварыць.

Асабліва хачу падкрэсліць, што наш век набліжаецца да завяршэння і мы хочам упарадкаваць нашу дзяржаву. Калі вы раптам возмеце ў Польскую Карону і Вялікае Княства Літоўскае імператарскага сына, то прапаную вам падпісаць з намі пагадненне. І нам будзе спакайней і дзяржавы нашы будуць жыць у міры. Калі ж вы хочаце нашага панавання ў вас, то няхай Паны-Рада абедзвюх дзяржаваў прынясуць нам прысягу і пісьмова пацвердзяць уласную згоду. Няхай яны нас запэўняць, што не будуць чыніць аніякай шкоды ані нам, ані нашым дзецям. Каб яны не выдавалі нашых дзяцей у іншыя краіны і не ўжывалі супраць іх аніякай хітрасці. Няхай Паны-Рада гарантуюць нам бяспеку падчас нашага знаходжання у Польскай Кароне і Вялікім Княстве Літоўскім, каб мы пачуваліся ў вас, як на сваёй зямлі.

Зноў кажу, калі Вялікае Княства Літоўскае хоча, каб мы панавалі толькі ў вас, без Польскай Кароны, мы з большай прыемнасцю прымем гэтую прапанову. Мы хочам быць і на адным Вялікім Княстве Літоўскім. Усе вашыя правы і вольнасці мы, як ужо абвясцілі, захаваем непарушнымі. Калі Паны-Рада пажадаюць абмеркаваць з намі нешта дадаткова, мы з ахвотай прымем іх і таму даем табе даверчы ліст для новага пасольства.

Кажам табе і перадаем Панам-Радзе, каб ні пры якіх абставінах не абіралі сабе гаспадара з французскай двара, бо ён будзе спрыяць Турэччыне, а не Хрысціянству. Калі возмеце француза, дык вы, літва, хутка спазнаеце, што ён з вамі зробіць.

І яшчэ хачу табе сказаць. Многія паны з вашых земляў пісалі да мяне, каб я з войскам рушыў да Полацка. Яны хочуць прысягнуць мне на вернасць, каб я стаў вашым гаспадаром і не спустошыў іх уладанняў. Іншыя пісалі мне пра розныя рэчы, але пра іх зараз не варта згадваць. Некаторыя з вашых паноў прасілі ў мяне золата і сабалёў, а наўзамен выказвалі жаданне абраць мяне вашым панам. Усё гэта перадай Панам-Радзе”.

Вялікі князь маскоўскі даў мне ліст, у якім усе яго ўмовы былі выкладзены пісьмова, і загадаў мне быць у яго на абедзе.

У хуткім часе пасля абеда вялікі князь даў мне на развітанне руку і адпусціў дадому. Ад сябе і ад сваіх двух сыноў ён перадаў паклон вашым міласцям.

3 сакавіка, у аўторак, калі я хацеў выпраўляцца ў дарогу, прыехалі да мяне ў пасольскі двор людзі вялікага князя, якія прысутнічалі падчас маёй аўдыенцыі ў яго – Васіль Умны, Міхайла Пляшчэеў, дзякі Андрэй і Васіль Шчаўкалавы. Яны сказалі мне наступнае:

“Божай міласцю цар і вялікі князь Іван Васільевіч загадаў давесці табе яшчэ раз, што ён хоча быць гаспадаром у Вялікім Княстве Літоўскім, не прэтэндуючы на Польскую Карону. Ён гарантуе спакой у Княстве і мір з Польшчай. Ты перадай Панам-Радзе, каб яны хутчэй схіліліся да добрай справы. Няхай яны напішуць да ўрадоўцаў Кіева, Чаркас, Канева, Пуціўля і даведаюцца ў іх аб планах перакопскага цара. Няхай яны схіляць усіх на наш бок”.

**Пераклаў Іван САВЕРЧАНКА**

**Справка**

**САВЕРЧЕНКО Иван Васильевич.**
*Степень.* Доктор филологических наук.
*Место работы.* Национальная академия Наук Беларуси.
*Должность.* Ведущий научный сотрудник Института языка и литературы им. Я.Коласа и Я. Купалы Национальной академии наук Беларуси.
*Паспорт.* MP 2269866. Выдан 27.04.2007 Московским РУВД г. Минска.
Личный номер 3020462A051PB5
*Домашний адрес.* 220004 г.Минск. ул. Короля 26 – 18.
Тел. д.2-00-08-65.
Маб. (+375 29) 157-84-41.
e-mail: ivasav_62@mail.ru